# ВІНШУЕМ!

На пачатку снежня ў Наўгародскім дзяржаўным універсітэце імя Яраслава Мудрага праходзіла абласное свята асветы, адукацыі і навукі «Яраславаў дзень-2016». Адным з цэнтральных яго мерапрыемстваў стаў урачысты сход, падчас якога былі ўручаны галоўныя ўзнагароды расійскай ВНУ – медалі Яраслава Мудрага і рэгаліі звання «Ганаровы доктар НаўДУ». Прыемна, што гэта званне атрымаў прарэктар па вучэбнай рабоце нашага ўніверсітэта В.І. Туркоўскі.

Веслаў Іосіфавіч зрабіў значны ўнёсак у развіццё супрацоўніцтва паміж Наўгародскім і нашым універсітэтамі: як каардынатар праектаў у рамках праграмы ТЭМПУС быў адным з арганізатараў міжнародных канферэнцый і семінараў, пад яго кіраўніцтвам былі падрыхтаваны сумесныя публікацыі навукоўцаў наўгародскай і нашай навучальных устаноў, праведзены тыдні расійска-беларускага супрацоўніцтва і абмен студэнтамі і выкладчыкамі. Акрамя таго, па ініцыятыве В.І. Туркоўскага была распрацавана і рэалізавана сумесная магістарская праграма «Адукацыйны менеджмент».

На сённяшні дзень завяршаецца праект «Подготовка педагогов и образовательных менеджеров к работе с гетерогенными группами и организаторами», а ў кастрычніку паміж Наўгародскім і нашым універсітэтамі было падпісана пагадненне аб сумеснай рэалізацыі праекта «Становление и развитие педагогической метатеории управления многообразием в образовательных системах».

Веслаў Іосіфавіч адзначыў, што прысуджэнне яму ганаровага звання – гэта, у першую чаргу, прызнанне грамадскай значымасці сумеснай работы двух універсітэтаў. Студэнты і выкладчыкі павінны і надалей развіваць супрацоўніцтва паміж нашымі ВНУ.

**УЛАСНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ.**